*Бяспалая М.А.*

# АСАБЛІВАСЦІ КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНАГА ПРАЦЭСУ Ў БЕЛАРУСІ НА ПАМЕЖЖЫ XIX—XX стст.

Пытанне, якое вынесена ў загаловак, мае вельмі шырокае праблемнае поле, нягледзячы на яго ўсебаковае вывучэнне навукова савецкага, і паслясавецкага перыяда. У выніку актыўнай даследчыцкай працы выяўлена шмат цікавых гістарычных фактаў, вернута ў нашу гісторыю многа знакамітых людзей, аднак, як ні парадаксальна, праблемы не знікаюць, а наадварот, паглыбляюцца. Назапашаны факталагічны матэрыял прадстаўляе багатыя магчымасці для пошукаў новых метадалагічных падыходаў і тэарэтычных абгрунтаванняў па праблемах культуры. У гэтым аўтар поўнасцю згодны з пазіцыяй прафесара С.Я.Куль-Сяльверставай [1, с. 131].

На нашу думку ў разглядаемы перыяд можна адзначыць некалькі праблемных пытанняў, вельмі важных для разумення асаблівасцей культурна-гістарычнага працэсу. Адно з іх — чаму беларусы спазніліся ў нацыятворчым руху, хаця яны знаходзіліся ў пачатку XIX ст. на адной ступені з суседзямі, і якую ралю ў гэтай затрымцы адыгралі культурныя ўплывы суседніх народаў? Па пастаўленаму пытанню ў айчыннай навуцы фундаментальных работ амаль няма. Можна нагадаць артыкул С.Кузьняевай, прысвечаны фарміраванню нацыянальнай свядомасці ў першай палове XIX ст., работы М.Сакаловай па гэтаму перыяду. Затое ў суседняй Польшчы па вызначанай праблеме працуе Рышард Радзік з Люблінскага універсітэта, аб чым сведчыць яго цікавы артыкул “Прычыны слабасці нацыятворчага працэсу беларусаў у XIX– XX стст.” [3].

Другое праблемнае пытанне мае дачыненне да вызначэння месца і ролі ідэі краёвасці ў культурна-гістарычным развіцці Беларусі. На наш погляд яна магла б стаць сродкам нацыянальнага аб'яднання ў межах Беларусі. Адным з адмоўных яе бакоў некаторыя навукоўцы лічаць непазбежнае падпарадкаванне нацыяўтваральных працэсаў уплыву аднаго этнасу, маюцца на ўвазе мясцовыя палякі, да якіх належыла значная частка адукаванага грамадства. Аднак даследчыкі праблемы паказваюць, што “у іх вядомасці пачуццё прыналежнасці да польскай нацыі спалучалася з адчуваннем свайго беларускага або летувіскага паходжання і ўспрыманнем беларуска-літоўскага краю як Радзімы і зямлі продкаў. Краёвая ідэалогія грунтавалася на ідэі палітычнай нацыі, г. зн. на перакананні, што ўсе карэнныя жыхары краю незалежна

ад этнічнай прыналежнасці належаць да адзінай нацыі...” [4, с. 103]. Можна дадаць, што беларуская дзяржава пасля 1917 г. стваралася як дзяржава менавіта беларускага этнаса. Толькі ў кароткі перыяд беларусізацыі назіралася спроба ўключыць у нацыя і культуратворчыя працэсы і іншыя этнасы, якія пражывалі ў БССР. Тым не менш, нельга адмаўляць той відавочны факт, што сучасная беларуская культура сфарміравалася ў выніку сінтэзу культур усіх этнасаў, якія стагоддзямі жылі на адной тэрыторыі. Нам падаецца цікавай пазіцыя С.Я.Куль-Сяльверставай, якая звяртае ўвагу на тое, што “сам тэрмін “беларуская культура” выклікае шэраг пытанняў пры яго пераносе на канкрэтна-гістарычную глебу” [1, с. 132].

Трэцяе, што хацелася б адзначыць — гэта праблема заапалітызаванасці даследаванняў па гісторыі беларускай культуры і адраджэння XIX—XX стст. Гэта прывяло да нігілістычнай ацэнкі ролі шляхты ў гісторыі і культуры Беларусі, нераспрацаванасці пытанняў, звязаных з месцам трэцяга саслоўя ў гэтым працэсе. Нам падаецца, што згаданы нігілізм адмоўна адбіўся на фарміраванні не толькі нацыянальнай культуры, але і гістарычнай памяці народа. З яго гісторыі на пэўны час былі выкрэслены многія лёсавырашальныя падзеі і асобы. Апошнія па прычыне таго, што яны належалі да прыгнятальнікаў сялянскага люду, апошні разглядаўся ўдзельнікамі беларускага адраджэння як галоўная субстанцыя нацыя- і культура-творчага працэсу. Трэба дадаць, што ў савецкі перыяд былі забыты і тыя, хто актыўна працаваў на ніве адраджэння. У выніку наша гісторыя набыла аднабаковы характар і згубіла многіх са сваіх герояў. Нагадаем Т.Касцюшку, А.Міцкевіча, Я.Ясінскага, М.К.Агінскага і многіх іншых, якія сталі здабыткам польскай гісторыі і культуры. Зноў жа можна падтрымаць думку С.Я.Куль-Сяльверставай, якая на падставе аналіза прац беларускіх аўтараў паказвае запазычанасць тэрміна “польская культура” у вызначэнні культуры пануючага саслоўя і адукаванай часткі насельніцтва Беларусі з польскай і расійскай гістарыяграфіі, дзе яе ідэнтыфікацыя тэрмінам “польская” “ адбываецца на падставе моўнага крытэрыя і саманазвы дзеячаў культуры” [1, с. 132]. Сучасныя спробы вярнуць народу яго гісторыю і гістарычных дзеячаў патрабуюць значных навуковых, навучальных і асветніцкіх высілкаў. Задача цяжкая, бо згодна сацыялагічных даследаванняў 67,3 % маладых людзей да 20 год не маюць уяўлення аб сваёй культурнай спадчыне [4, с. 17].

Звернем увагу, што ў навуковай і навукова-метадычнай літаратуры не зусім выразна, на наш погляд, паказаны прычыны ўзнікнення ідэі беларускага адраджэння. Нам падаецца неабходным больш шырокі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аналіз значэння такой культурна-гістарычнай з'явы як распаўсюджанне ў беларускім грамадстве ідэй рамантызму, якія садзейнічалі канцэнтрацыі ўвагі на асобе з яе пераменлівым унутранным светам. Арганічна гэта спалучалася са зваротам да нацыянальнага пачуцця, таму што "кожная нацыя, кожны этнас пачалі ўяўляцца абагульненым індывідам, які мае свае асаблівыя рысы.... Рамантызм напоўніў паняцце нацыянальны ці народны (больш пашыраны ў XIX ст. тэрмін) новым зместам. З'яўляюцца паняцці "нацыянальны характар", "народная душа", "народная паэзія" і г. д. Безумоўна, у аснове гэтага працэсу ляжалі важнейшыя культурныя зрухі ў адукаваных колах грамадства. Яны, па словах С.Кузьняевай, сталі ўспрымаць традыцыйную народную культуру як самадастатковую культурную каштоўнасць у якой бралі пачатак культурныя і гістарычныя карані шляхецкай культуры" [2, 57].

Асэнсоўваючы гэты факт згаданы аўтар робіць выснову аб існаванні ў шляхецкім асяроддзі спрадвечных настрояў і пачуццяў краёвага мясцовага патрыятызму. Да гэтага можна дадаць слушную заўвагу А.Цвікевіча аб тым, што ў пэўны момант сацыяльна-эканамічнага развіцця насельнікі ВКЛ шукалі стрыжань свайго існавання ў працэсах нацыянальна-культурнага адраджэння [6, 187].

Такім чынам, да прычын, якія выклікалі першыя парасткі беларускага культурнага адраджэння, можна аднесці ўплыў такой культурна-гістарычнай з'явы як рамантызм. Асаблівасцямі культурна-гістарычнага развіцця Беларусі на мяжы XIX—XX стст. ёсць падставы лічыць узнікненне ідэі краёвасці, а таксама ўплывы польскай і рускай культур на гэты працэс.

ЛІТАРАТУРА:

1. Куль-Сяльверстава. Стан і праблемы беларускай гістарыяграфіі гісторыі культуры другой паловы XVIII – першых дзесяцігоддзяў XIX ст. // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: стан і перспектывы развіцця: Матэрыялы навук. канф., прысвеч. 70-годдзю Ін-та гісторыі НАН Беларусі (Мінск, 6—7 кастрычніка 1999 г.) / М.П.Касцюк, У.І.Навіцкі, Л.М.Лыч і інш. — Мн.: "Дэполіс", 2000. — С. 130—133.

2. Кузьняева С. Нацыянальнае адраджэнне і нацыянальная свядомасць беларусаў у першай палове XIX ст. // Беларускі гістарычны агляд. — Т. 1. — Мінск, 1994. — С. 54—65.

3. Радзік Рышард. Прычыны слабасці нацыятворчага працэсу беларусаў у XIX—XX стст. // Беларускі гістарычны агляд. — Т. 2. — Мінск, 1995. — С. 195—228.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Родевич Т.Н. Ценностные ориентации и досуговые интересы молодежи в социокультурной деятельности // Научно-техническая революция и проблемы гуманизма. Сб. науч. тр. под ред. Ю.А.Гусева. — Мн., 2002. — С. 16—21.

5. Смалянчук А. Дзённік Міхала Ромера як крыніца па гісторыі Беларусі пачатку XX ст. // Беларускі гістарычны агляд. — Т. 5. — Мінск, 1998. — С. 103—111.

6. Цьвікевіч А. "Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX — пачатку XX стст. — 2-е выд. — Мн.: Навука і тэхніка, 1993. — 352 с.

*Кузьмініч М.Л.*

## ВНУ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВА ЯК СУБ'ЕКТЫ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў ГРАМАДСТВЕ

ВНУ культуры і мастацтва займаюць важнае месца ў рэалізацыі сацыякультурнай палітыкі ў сучасным беларускім грамадстве. Універсітэт культуры, акадэміі музыкі і мастацтваў — вышэйшыя навучальныя ўстановы сістэмы адукацыі, закліканыя "забяспечыць найбольш поўнае развіццё здольнасцей і інтэлектуальна-творчага патэнцыялу асобы, магчымасць яе актыўнага, свабоднага і канструктыўнага ўдзелу ў развіцці грамадства з мэтай задавальнення патрэбнасцей грамадства і дзяржавы ў спецыялістах высокай кваліфікацыі" [1]. Змест дзейнасці гэтых вышэйшых навучальных устаноў увабраў шматвяковы гістарычны вопыт універсітэцкай адукацыі [4; 38-48].

Яшчэ ў Старажытнай Грэцыі ў адпаведнасці з класавым размежаваннем з'явіліся дзве сістэмы грамадскай адукацыі. Мэтай першай стала фарміраванне навыкаў практычнай працы, а другой — перадача духоўных і культурных каштоўнасцей. Пачынаючы з XI–XII стст., еўрапейскі універсітэт становіцца незалежнай, аўтаномнай установай. Ён забяспечваў развіццё і перадачу перадавых ведаў, а таксама навучаў метадам іх атрымання. Сутнасць універсітэта навукова-даследчага тыпу на мяжы XVIII–XIX стст. сфармуляваў В.Гумбальт: спалучэнне даследаванняў і навучання пры забеспячэнні свабоды для выкладчыкаў і студэнтаў ад умяшання з боку дзяржавы.

Са зменай сацыяльных каштоўнасцей у грамадстве мянялася і канцэпцыя універсітэцкай адукацыі. Так, для англійскіх утылітарыстаў XIX ст. галоўным у змесце адукацыі стала ступень яе карысці для грамадства. Функцыя універсітэта, на думку утылітарыстаў, — у правяд-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ